



## У НУМАРЫ



| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
|---|---|
| **Калядны час у музеі-запаведніку** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **Віншуем са святамі!** | **Лекцыя “Кропкі фотагісторыі: Заслаўе на фотаздымках 1950-60-х гг.”** |
| **У чаканні адкрыцця** | |



## ***Навіны***

### Калядны час у музеі-запаведніку

Зіма для музея-запаведніка распачалася традыцыйнай тэатралізаванай Каляднай праграмай, у якой прымаюць удзел вельмі многія нашы супрацоўнікі. Апрача асноўнай праграмы арганізаваным групам таксама дадаткова былі прапанаваны святочныя батлеечныя паказы-спектаклі. У справе правядзення спектакляў задзейнічаны *Ксенія Сямашка і Генадзь Сівохін (робяць паказы разам), а таксама Ганна Гарбачонак*, якая нядаўнім часам удала засвоіла ўменне праводзіць батлейкі і зацвердзіла гэта на практыцы.

У асноўнай праграме практычна ёсць усё, што характэрна для беларускай Каляднай традыцыі: гэта Каза (у шэрай світцы) і Мядзведзь (у вывернутым вонкі кажуху) ў масках у хаце, Калядоўшчыкі з зоркай, Гаспадыня і, канечне ж – госці, якіх падымаюць на танцы-скокі, на гульні, з якімі вясёла спяваюць. Але, вядома, прысутнічаюць і пэўныя дадатковыя элементы. Так, напрыклад, у праграме на этнаграфічным комплексе прысутнічае такі персанаж як Млынар, да дзяцей на вуліцы падыходзяць раставыя лялькі – Каза і Мядзведзь, па завяршэнні праграмы ў хаце да дзяцей выходзіць Дзед Мароз. Асноўная праграма ўключае ў сябе, чым дадаткова пашыраецца, яшчэ і наведванне Дзіцячага музея міфалогіі і лесу, дзе Баба Яга распавядае дзецям пра таямніцы беларускага лесу: пра

духаў-істотаў, у якіх верылі нашы продкі, а таксама пра жывёл і птушак, якіх можна пабачыць у прыродзе і цяпер, зычыць усім добрыя святы.



*Частка нашых удзельнікаў Каляднай праграмы; першы шэраг (злева-направа): Людміла Дакука, Анатоль Якімовіч, Ірына Арцем'ева, другі шэраг: Вольга Крупская, Барыс Харэвіч*

У асноўнай частцы актыўны ўдзел прымаюць наступныя нашы супрацоўнікі: *Барыс Харэвіч, Ірына Арцем'ева, Вольга Крупская, Алена Пакінка, Людміла Дакука, Анастасія Палягошка, Юлія Вяржбіцкая, Тамара Гудына, Таццяна Арлова і Ігар Кандратовіч*. З частаваннем гасцей і парадкам у хаце заўсёды ўдала дапамагае наша наглядчыца *Алена Старавойтава*. Вельмі значную дапамогу ў правядзенні Калядак нам аказвае выдатны музыка *Анатоль Якімовіч* – сапраўдная душа Каляднай праграмы.

Госці на нашу Калядную праграму прыязджаюць з розных гарадоў Беларусі, але, асноўным чынам – з Мінску. Гэта абумоўлена рознымі акалічнасцямі, у тым ліку лагістыкай: ад Заслаўя да сталіцы і наадварот можна вельмі хутка даехаць і заашчадзіць на транспартных выдатках.

Прыемна, што і гэтым годам Калядная традыцыя музея-запаведніка працягваецца. У гэтым ёсць унёсак кожнага ўдзельніка праграмы, бо без людзей, якія робяць свята для гасцей, няма ні свята, ні настрою. Традыцыя паўтараецца, а, значыць, яна працягвае жыць у народзе.

**Віншуем са святамі!**

Музей-запаведнік шчыра віншуе шаноўных чытачоў з Новым годам і Раством Хрыстовым, з Калядамі! Святочны час – гэта той час калі ўсе, не толькі дзеці, але і дарослыя, згадваюць пра тое, што цуды здараюцца. Хай сабе гэтыя цуды могуць быць і зусім маленькімі, але, нават маленькія цуды, тым не менш, не перастаюць быць чароўнымі і каштоўнымі для сэрца. Кожны з нас можа стварыць такі маленькі цуд для іншага: для родных, сяброў, калег і прыяцеляў, кожны можа зрабіцца крыху чараўніком у святочны час. Не прамініце гэткай цудоўнай магчымасці: для душы яна вельмі важная і ўзрушальная. Не палянуйцеся гэтай зімой зляпіць снегавіка, колькі б Вам не было гадоў, ведайце, што ляпіць снегавіка ў любым узросце добра, асабліва ў вясёлым гурце сяброў!



*Святочная паштоўка 1994 г., аўтар выявы – мастак Р. Дасцян*

Наш калектыў шчыра рады, што і мы здолелі прыўнесці хаця б і крышку чараўства ў дзіцячыя мары, праводзячы для груп Калядную праграму. Мы спадзяемся, што дзеці, вярнуўшыся дахаты, прывязуць з сабою яго і бацькам, падзеляцца з імі сваім святочным захапленнем і нагадаюць дарослым зноў, што цуды здараюцца. Не расчароўвайце малых, яны не менш, чым дарослыя, маюць права на цуд. Дзяцінства – гэта той час, калі лепш за ўсё верыцца ў чароўнае.

Мы рады нагодзе, шаноўныя чытачы, жадаць Вам добрага здароўя, усялякіх поспехаў у справах, каб мелі Вы ў сэрцы надзею на лепшае, былі спагадлівымі да бліжніх, любілі свае сем'і і клапаціліся пра іх, а таксама

заўжды знаходзілі хвілінку, каб пачытаць нашу газету. Будзьце шчаслівыя, са святамі Вас!

## Заслаўе ў беларускай культуры

У беларускай культуры — мноства граняў, кожная з якіх з'яўляецца часткай яе цэласнай будовы. Зараз у нас святочны час Калядаў, таму актуальна непасрэдна да Калядаў і звярнуцца.

Пэўна, многія ведаюць, што Калядкі пэўны час былі крыху забытыя і бытаванне іх у якасці традыцыі ў многіх мясцінах Беларусі на пэўны час перарвалася. Аднак, у часы "перабудовы" (1980-я гады) з'явіліся моладзевыя суполкі, якія ўзяліся за аднаўленне народных традыцый, у тым ліку — Каляднай. І вось адным з такіх адметных цэнтраў аднаўлення гэтай традыцыі стала і Заслаўе.




*Віншавальная паштоўка "З Калядамі!" (мастак І. Шпунт, 1998 г.)*

Таксама вядомасць Заслаўя ў беларускім грамадстве актыўна пашыралася дзякуючы турыстычнаму складніку: тысячы дзяцей і дарослых штогод наведвалі гэтыя мясціны, дзівіліся з багатай гісторыі Заслаўя і яго ваколіц.

Пэўна, менавіта таму Заслаўе як асацыяцыя з Калядамі і багатай гісторыяй нашай краіны, увогуле як асацыяцыя з Беларуссю трапіла ў 1998 г. на віншавальную паштоўку з Калядамі, падрыхтаваную ў дзяржаўным выдавецтве для перасылкі поштай. Тыраж паштоўкі склаў 25 тысяч экзэмпляраў, выяву да яе падрыхтаваў мастак І. Шпунт.

Аснову выявы складае адлюстраванне галоўнага помніка архітэктуры Заслаўя (і, адначасова, адной з найбольш важных гісторыка-культурных каштоўнасцяў краіны) — Свята-Праабражэнскай царквы (зараз — Кафедральны сабор Праабражэння Гасподня), у атачэнні невялічкіх драўляных хатак, якія дадаюць выяве цеплыню і ўтульнасць, а ў небе над імі гарыць традыцыйная васьміканцовая Калядная зорка — галоўны атрыбут Каляднай традыцыі.

Далёка не кожны населены пункт Беларусі можа пахваліцца тым, што ён трапіў на віншавальную паштоўку да свят, падрыхтаваную не прыватным чынам у колькасці адзінкавых экзэмпляраў, а выдадзеную дзяржаўным выдавецтвам даволі значным тыражом. Заслаўе мае такую магчымасць, якая выступае чарговым пацверджаннем высокага значэння Заслаўя для беларускай гісторыі і культуры.

**У чаканні адкрыцця**

Многім нашым чытачам выдома, што на дадзены момант музей-запаведнік у Заслаўі мае чатыры асноўныя аб'екты: музейна-выставачны комплекс, этнаграфічны комплекс, Дзіцячы музей міфалогіі і лесу, а таксама “Музей-ДОТ”. Кожны з гэтых аб'ектаў з'яўляецца вельмі карысным для захавання і раскрыцця самых розных граняў беларускай гісторыі і культуры.

Экспазіцыі дадзеных аб'ектаў пэўным чынам дадаюцца і ўдасканальваюцца. Так, напрыклад, у 2018 г. музейна-выставачны комплекс дадаўся новай стацыянарнай экспазіцыяй – “Гандлёвая лаўка канца XIX – пачатку XX стагоддзя”, якая раскрывае тэму раздробнага гандлю як у Заслаўі, так і ў Беларусі агулам. Экспазіцыі іншых аб'ектаў перыядычна дадаюцца новымі экспанатамі. Так, на этнаграфічным комплексе ў будынку млына гэтым годам былі пастаўлены выдатныя рарытэтныя вагі, якія добра дапасоўваюцца да існуючай экспазіцыі. Гэта толькі некаторыя пашырэнні і ўдасканаленні, насамрэч, іх можна згадаць больш.

Але, больш важна тут звярнуцца да таго, што хутка наш музей-запаведнік мае папоўніцца новым аб'ектам – Музеем беларускай маляванкі. У гэтым новым аб'екце будзе прадстаўлена найбагацейшая ў Беларусі

калекцыя маляваных дываноў (“маляванак”), сабраная нашым музеем-запаведнікам за многія гады плённай працы, у тым ліку – экспедыцыйнай. Сярод іх – арыгінальныя працы Язэпа Драздовіча, Алены Кіш, іншых аўтараў, а таксама маляванкі, аўтары якіх нам, на жаль, невядомыя.

Асноўныя працы на згаданым вышэй новым аб'екце ўжо выкананы, таму можам спадзявацца, што яго ўрачыстае адкрыццё, аб акалічнасцях якога паведамім дадаткова, адбудзецца ў 2023 г. Да будучага адкрыцця актыўна вядзецца падрыхтоўка. Так, напрыклад, у яе межах былі выдадзены буклеты на беларускай і рускай мовах (“Беларускія маляванкі”, “Белорусские расписные ковры”). Аўтарамі тэксту буклетаў з'яўляюцца супрацоўнікі аддзела фондаў, якія дасканала ведаюць калекцыю “маляванак” музея-запаведніка, – Аляксандр Рак і Ірына Арцем'ева; вёрстка выканана УП “Рифтур”. Выдадзены буклеты УП “Рифтур” (Мінск) накладам у 7500 экзэмпляраў.




*Буклет “Беларускія маляванкі” (беларускамоўны варыянт)*

У буклетах змешчана інфармацыя пра карані народнай творчасці, якая ўвасобілася ў маляваных дыванах, пададзена інфармацыя, звязаная з калекцыяй музея-запаведніка непасрэдна, а таксама арыгінальныя ілюстрацыі некаторых твораў. Згаданая вышэй друкаваная прадукцыя ёсць у вольным продажы: набыць яе можна ў касе музейна-выставачнага комплекса (вул. Рынкавая, 4).

Зараз мы ў чаканні адкрыцця Музея беларускай маляванкі. Упэўненыя, што гэта будзе падзеяй не толькі для Заслаўя ў прыватнасці,

але і для Беларусі агулам. Будзем шчыра рады запрасіць Вас на адкрыццё, каб раздзяліць гэтую радасць разам!

## Навуковая праца

### Лекцыя “Кропкі фотагісторыі: Заслаўе на фотаздымках 1950-60-х гг.”

*/працяг — рэд./*

**2.** Звернем увагу на тое, што наш лекцыйны занятак “**Кропкі фотагісторыі: Заслаўе на фотаздымках 1950-60-х гг.”**, уключае ў сябе ў асноўным вывучэнне фотаздымкаў людзей (партрэтнага і калектыўнага кшталту), а не краявідаў самога Заслаўя, бо асобныя краявіды таго часу сустрэць можна выключна рэдка, будынкі трапляюць у кадр больш выпадкова, фрагментарна, выступаюць у якасці натуральнага фона фотаздымкаў. Засяродзімся пераважна на людзях, а не на архітэктуры, але пэўныя яе элементы ўсё адно будуць сустракацца нам на выявах.




*Школа рабочай моладзі, 1957 г. (КП 4756)*

Пры разглядзе фотаздымкаў, якія захоўваюцца ў фондах музея-запаведніка, маем зрабіць іх пэўную класіфікацыю, адзін з яе магчымых варыянтаў, які не прэтэндуе на вычарпальнасць і канчатковасць, але адлюстроўвае асноўныя асаблівасці адзначаных у ім катэгорый і падкатэгорый. Галоўным чынам, фотаздымкі трэба падзяліць на дзве буйныя катэгорыі – **публічныя і прыватныя**, а далей ужо уключыць у іх

шэраг больш дробных падкатэгорый. Да **публічных** адносяцца *фотаздымкі вучняў школ і выхаванцаў дзіцячых садкоў, працоўных калектываў, выявы са святочных дэманстрацый і мітынгаў*. Да **прыватных**, перш-наперш, адносяцца *партрэтныя фотаздымкі (не для дакументаў), на якіх выяўлены адзін чалавек або група людзей (сям'я, сябры, дарослыя і дзеці), асобныя фотаздымкі з армейскай службы, фотаздымкі асобных людзей на працы, на дэманстрацыях для захавання сямейных і прыяцельскіх успамінаў*.




*Выпускнікі дзіцячага садка, 1956 г. (КП 6000)*

Разгледзім напачатку падкатэгорыі першай катэгорыі на канкрэтных прыкладах, а затым звернемся да разгляду другой. Так, у ліку фотаздымкаў **публічнай катэгорыі** *падкатэгорыі фотаздымкаў вучняў школ і выхаванцаў дзіцячых садкоў*, мы бачым фота 25-ці выпускнікоў 10-га класа Заслаўскай школы рабочай моладзі (ШРМ) 1957 г. (КП 4756). Наконт ШРМ адзначым наступнае: у савецкі час існавалі школы рабочай моладзі, дзе навучаліся зусім не дзеці, а дарослыя розных узростаў, якія працавалі і адначасова вучыліся, спасцігаючы агульнаадукацыйную школьную праграму, якую не мелі магчымасці, па розных прычынах, прайсці ў дзіцячым узросце. У рэчышчы школы, але ўжо звычайнай, у якой вучыліся дзеці, прывядзем прыкладам таксама і фота выпускнікоў 8 “а” класа за 1965 г. (КП 5995). У першым шэрагу бачым настаўнікаў, якія сядзяць, а ў іх за

спіною ў поўны рост стаяць тры шэрагі вучняў. Пэўна, для гэтага фота нават быў скалочаны спецыяльны часовы памост, каб такім чынам уладкаваць кампазіцыю. Клас вялікі – на 30 вучняў. Датычна выхаванцаў дзіцячых садкоў згадаем, напрыклад, фота з выпускнікамі Заслаўскага дзіцячага садка 1956 г. (КП 6000). Размяшчаўся ён раней у сучасным будынку адміністрацыі музея-запаведніка (вул. Рынкавая, 8а). Дзяцей (23-х выхаванцаў) сфатаграфавалі ў двары, на фоне відаць драўляныя будынкі. Хлопчыкі і дзяўчаткі апранутыя па модзе 1950-х гг., маюць характэрныя для таго часу прычоскі. На фота 1960-х гг. мы бачым “ранішнік” у дзіцячым садку (КП 5909), які адбываецца ў памяшканні садка, абстаўленым адпаведнай часу мэбляй і посудам. Жанчына-музыка грае на піяніна, дзеці разам з дзвюма выхавацелькамі (або, магчыма, выхавацелькай і яе памочніцай) спяваюць песню. Некалькі малых трымаюць у руках сцяжкі і паветраныя шарыкі. Магчыма, што гэта 1-га мая або Дзень працы.




*Дзень працы – 1 мая 1956 г., дзеці з партрэтамі, шарыкамі і сцяжкамі (КП 4874)*

Далей, у межах усё той жа катэгорыі, разгледзім падкатэгорыю *фотаздымкаў працоўных калектываў*. Так, напрыклад, бачым фота супрацоўніц Заслаўскага дзіцячага садка, якое адносіцца да 1960-1965 гг. (КП 5994). На ім – 10-ць жанчын сядзяць і стаяць у два шэрагі, крыху відаць інтэр’ер пакоя: шафу, крэсла, побач часткова ў кадр трапілі сталы, за якімі ядуць дзеці. Цікавым з’яўляецца фота Заслаўскай сандружыны 1958-1960

гг. (КП 3678). 22-е жанчыны, большасць якіх апранутая ў халаты, выстраеныя ў тры шэрагі. Адна з жанчын мае цераз плячо ленту з надпісам “Камандзір санітарнай дружыны”, побач з ёю стаіць мужчына-лекар. Сандружыны раней утвараліся на базе розных калектываў, галоўным чынам з ліку жанчын. На базе сандружын працоўных калектываў населенага пункта ўтваралася зборная сандружына населенага пункта (горада або гарадскога пасёлка). Асноўнымі задачамі сандружынніц былі ўменне тэрмінова аказаць медыцынскую дапамогу параненаму або траўмаванаму чалавеку ў надзвычайнай сітуацыі, а таксама – удзел у спаборніцтвах, якія перыядычна праводзіліся паміж сандружынамі. Да гэтай жа падкатэгорыі адносіцца і фота супрацоўнікаў Заслаўскага аддзела міліцыі 1950-х гг. (КП 3670). Тут мы бачым пяць супрацоўнікаў у форме: 4-х радавых і іх камандзіра – лейтэнанта. Адзін з радавых, відаць, франтавік, бо мае ордэн і тры медалі, большасць якіх можна вызначыць дакладна: ордэн Чырвонай Зоркі, медаль “За адвагу”, “За перамогу над Германіяй”. Цікавым таксама з’яўляецца фота харавога калектыва Заслаўскага РДК, зробленае у маі 1953 г. (КП 4755). Калектыў даволі вялікі: складаецца з 38 спевакоў і акампаніятара. Акампаніятар з гармонікам сядзіць паперадзу спевакоў, якіх на фота размясцілі ў два шэрагі. Першы складаецца цалкам з дзяўчат, а другі – цалкам з хлопцаў. Магчыма, што калектыў размясціўся для фота менавіта такім парадкам, як ён звычайна выступаў на святах, а шэрагі падзеленыя на выключна дзявочы і выключна мужчынскі з мэтай чаргавання галасоў і атрымання спецыфічнага гучання.



*Партрэтная выява мужчыны, 1956 г. (КП 5992)*

У працяг да першай катэгорыі прывядзем падкатэгорыю *выяў са святочных дэманстрацый і мітынгаў*. Так, напрыклад, у ліку падобных бачым шэраг фота з дэманстрацыі да Дня працы 1 мая 1956 г. На адным з іх (КП 5849) бачым групу лекараў г. Заслаўя, два з якіх нясуць разгорнуты транспарант, верх якога не трапіў у кадр. На другім (КП 4874) – шмат дзяцей-школьнікаў з шарыкамі, транспарантамі і партрэтамі Молатава, Леніна і іншых, у суправаджэнні дарослых. На трэцім (КП 4873) – бачым усё тую ж першамайскую калону з дзяцей і дарослых ля трыбуны, з якой па чарзе выступаюць прадстаўнікі кіраўніцтва. Да шэрагу дэманстрацый адносіцца і фота мітынга да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі 7 лістапада 1957 г. (КП 5850). Бачым калону людзей, якія нясуць разгорнутыя транспаратны, партрэты. Па вакольным краявідзе і іншых акалічнасцях, можна казаць пра тое, што мітынг у адлюстраваны момант праходзіць паркам, які знаходзіцца перад касцёлам Найсвяцейшай Дзевы Марыі (тады – разбуранай царквы Раства Багародзіцы). Цікава, што на некаторых фотаздымках з дэманстрацый і мітынгаў сустракаюцца не толькі гатовыя партрэтныя выявы лідэраў сацыялізму, якія выкарыстоўваліся ў якасці традыцыйных атрыбутаў, але і некаторыя іншыя святочныя элементы, зробленыя сваімі рукамі, напрыклад, – вялікія пяціканцовыя зоркі (КП 4879), якія несліся на дрэўках.



*Дзве дзяўчынкі з бантамі стаяць на памосціку з дошак, за спіною ў іх сквер (КП 5815)*

Цяпер звернемся да **катэгорыі прыватных** фотаздымкаў, а менавіта – да падкатэгорыі *партрэтных фотаздымкаў (не для дакументаў), на якіх выяўлены адзін чалавек або група людзей (сям'я, сябры, дарослыя і дзеці),*

*для захавання сямейных і прыяцельскіх успамінаў.* Гэта, напрыклад, партрэтная выява мужчыны ў пояс, зробленая ў 1956 г. (КП 5992), партрэтная выява жанчыны па плечы з прыбраным фотамайстрам фонам (КП 5967), фота мужчыны ў плашчы, зробленае на фоне драўлянай забудовы ў поўны рост (КП 5817), фотаздымак 1955 г., на якім выяўлены дзве жанчыны, што трымаюць на руках маленькага хлопчыка (КП 3674), фота дзвюх маленькіх дзяўчынак з бантамі пры арыгінальным фоне, якія стаяць на памосціку з дошак (КП 5815), партрэт хлопца, апранутага ў паліто, са стосам кніжак пад пахай, з арыгінальным фонам, зробленае ў 1960 г. (КП 4761) і іншыя. Подпісы на шэрагу фотаздымкаў (кшталту, “ад Валі” (КП 4762), “ад Лёлі” (КП 4763), “помні, не забывай” (КП 5818)) сведчаць пра тое, што гэтыя фотаздымкі былі падораныя на памяць. У савецкі час існавала традыцыя абмену партрэтнымі фотаздымкамі, на якіх рабіліся дарчыя надпісы, пакідаліся пажаданні, часам – пісаліся нават вершы, пры канцы ставілася дата, назва населенага пункта. Многія захоўвалі іх на працягу ўсяго жыцця ў сваіх фотаальбомах.



Супрацоўніцы Заслаўскай аптэкі №22, 1961 г. (КП 5820)

Далей звернемся да падкатэгорыі *асобных фотаздымкаў з армейскай службы для захавання прыяцельскіх успамінаў*. Раней, калі хлопца забіралі на службу ў армію, там рабіўся шэраг фотаздымкаў, якія потым збіраліся ў спецыяльны (дэмбельскі) альбом, які салдат забіраў дахаты па заканчэнні службы. На такіх фота можна пабачыць розныя моманты салдацкага побыту (пастраенне, абед, паход на канцэрт, у кіно, слуханне

палітінфармацыі, салдат на фоне сценгазеты ваеннай часткі (“Боевой листок”)), некаторыя моманты з вучэнняў і маршкідкоў. Шэраг падобнага кшталту фотаздымкаў можна пабачыць у фондах музея-запаведніка. Так, напрыклад, на адным з фота (КП 5915) мы бачым салдат, якія сядзяць у залі ці то на нейкім сходзе, ці то на канцэрце, магчыма, што глядзяць кіно. На пярэднім плане сядзяць радавы, маёр і старшы сяржант, што вызначаецца па пагонах.

Далей звернемся да падкатэгорыі *фотаздымкаў асобных людзей на працы, на дэманстрацыях для захавання прыяцельскіх успамінаў.* Так, напрыклад, мы бачым фота, на якім адлюстраваўся склад брыгады хуткай дапамогі Заслаўскага раёна пры медыцынскім грузавым аўтамабілі з чырвоным крыжам у белым коле (КП 3672). Гэты фотаздымак адносіцца да 1950-х гг. У гэтым жа рэчышчы выканана фота Заслаўскага хірурга 1955 г. (КП 3671), фота аперацыйнай сястры 1955 г. (3673), фотаздымак, на якім выяўлены дзяўчаты (пэўна, фармацэўты) за працай у Заслаўскай аптэцы №22, зроблены ў 1961 г. (КП 5820), і іншыя.




*Фота трох мужчын на фоне дошкі гонару і лозунгаў, 1950-я гг. (КП 4870)*

У ліку фотаздымкаў на дэманстрацыях, можам прывесці фота трох мужчын, якія засняты на фоне расцяжкі-транспаранта, замацаванай на фасадзе драўлянага будынка (КП 5813). На транспаранце надпіс: “Прыкладзем усе намаганні на датэрміновае выкананне вялікай праграмы шостай пяцігодкі!” (“Приложим все усилия на досрочное выполнение шестой пятилетки!”) Гэты надпіс падказвае нам, што фота зроблена паміж 1956-м і 1960-м гадамі. Падобнага кшталту калектыўнае фота (пяці мужчын) зроблена пры помніку Леніна, які, калі меркаваць па бляску, пафарбаваны –

гіпс пакрыты фарбай (КП 5816). Сюды ж адносіцца фота 1950-х гг., на якім бачым трох мужчын на фоне дошкі гонару, розных лозунгаў, сярод іх – цэнтральны: “Няхай жыве і мацнее саюз рабочага класа і калгаснага сялянства – непарушная аснова Савецкага ладу!” (“Да здравствует и крепнет союз рабочего класса и колхозного крестьянства – незыблемая основа Советского строя!”) (КП 4870).

Фотаздымкі выступаюць у якасці фотадакументаў, асаблівых крыніц, якія перадаюць візуальную гісторыю. Па Заслаўі за розныя гады іх маецца неаднолькавая колькасць: па адным перыядзе іх больш, па другім – шмат, а па трэцім – лічаныя адзінкі. Найбольш каштоўнымі па Заслаўі з’яўляюцца фотаздымкі першай паловы ХХ ст., бо іх захавалася вельмі няшмат. Заслаўскія фотаздымкі 1950-1960-х гг., калі Заслаўе было гарадскім пасёлкам, – больш частая з’ява, чым фотаздымкі першай паловы ХХ ст., але, у параўнанні з наступнымі дзесяцігоддзямі, іх таксама не надта многа. Фотаздымкі 1950-1960-х гг., што сталі прадметам увагі дадзенай лекцыі, вельмі каларытныя і цікавыя, у іх адчуваецца павеў эпохі, якая сыйшла, але засталася ў гісторыі. Прапанаваны ў лекцыі падзел на катэгорыі – **публічныя і прыватныя**, а іх, у сваю чаргу, – на шэраг падкатэгорый, з’яўляецца ўмоўным, але абумоўленым пэўнымі супольнымі рысамі, мэтай зрабіць абагульненне. У дадатак трэба заўважыць, што вывучаліся менавіта і толькі тыя фотаздымкі, якія захоўваюцца ў фондах гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе”, без звароту да вывучэння фотаздымкаў, якія маюцца ў прыватных асоб – сем’яў і калекцыянераў.

*Калі раптам у вашых дзядоў і бабуль або бацькоў маюцца старыя фотаздымкі Заслаўя і яго жыхароў, то вы можаце падараваць іх нашаму музею або даць нам зрабіць з іх копіі – так вы зможаце дапамагчы нам збіраць гісторыю, бо музей – гэта справа агульная, для ўсіх і кожнага.*

*навуковы супрацоўнік музея*
*Ігар Кандратовіч*

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.